View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

# АБ НЕКАТОРЫХ ПЫТАННЯХ С1СТЭМАТЫЗАЦЫ1 ВАЕННАГА ЗАКАНАДАУСТВА БЕЛАРУС1

**В. А. Шаршун**

*Нацыянальны цэнтр прававой тфармацъи Рэспублт Беларусь*

йстэматызацыя ваеннага заканадауства як мстэмы нарматыуных прававых актау, яшя рэгулююць грамадсшя адносіны у вобласці забеспячэння ваеннай бяспекі дзяржавы, з'яуляецца аб'ектыуным патрабаваннем удасканалення прававой базы будаунщтва Узброеных Сш, іншых войск і вайсковых фарміраванняу Рэспублікі Беларусь. Таму уяуляе вялікую цікавасць вывучэнне дзейнасці па мстэматызацып ваеннага заканадауства у розныя перыяды гісторыі Беларусі. Усю псторыю сістэматызацыі ваеннага заканадауства у гісторыі Беларусі можна умоуна падзялщь на чатыры перыяды: перыяд Вялшага Княства Л^оускага (XVI в.-1795 г.), перыяд Расшскай імперыі (1795-1917 гг.), савецш перыяд (1917-1991 гг.), постсавецш перыяд (з 1991 г. па цяперашш час). Вытокі ваеннага права Беларум зыходзяць да звычаёвага права, якое пераважала да сярэдзшы XV ст., а затым стала выцясняцца пісаным правам, у яшм звычаёвыя нормы набылі форму законау у выглядзе грамат, прывшей і іншых прававых актау.

Упершыню у гісторыі Беларусі ваеннае права як сукупнасць прававых норм, яшя рэгламентуюць вайсковыя праваадносшы, і адасобленая галша права, было вылучана в я л ^ м беларускім гуманістам і асветншам Францыскам Скарынай. У прадмове да к н т «Другі закон» ён дау аналіз асноуных прынцыпау права, яго паходжання, прызначэння і дзялення на галшы. Адной з галш права Ф. Скарына лічыу права «рицерское или военное, еже на войне соблюдаемо бываеть « [1, с. 65 ].

Шсанае ваеннае права ВКЛ пачало развівацца у XVI ст. Першымі воінскімі законамі былі пастановы Наваградскага (1502), Вшенскага (1507), Менскага (1507) і іншых сеймау [2, с. 230 ]. У псторып Беларум кадыфікацыя норм ваеннага права упершыню была ажыццёулена у Статуце ВКЛ 1529 г., яш вызначыу круг ваеннаабавязаных, прадугледжвау меры пакарання за невыкананне вайсковых абавязкау і за злачынствы, здзейсненыя ваярамі, рэгламентавау правы і абавязкі гетмана. Далейшае развщцё і сістэматызацыя норм ваеннага права атрымала у Статутах

ВКЛ 1566, 1588 гг. Раздзел II «Аб абароне земскай» Статута ВКЛ 1588 г. падрабязна рэгламентавау пытанш ваеннага права, у прыватнасщ, крымшальнай адказнасщ ваяроу [3, с. 34-40].

Першы у ВКЛ зборнік заканадаучых актау па ваенным праве «Артыкулы ваенныя» быу выдадзены па загадзе вшенскага ваяводы і гетмана Вялшага Княства ЛітоУскага Міхаіла Казіміра РадзЬ віла у 1754 г. у Нясвіжы [4]. Гэта кшга была першым мстэматызаваным выданнем актау ваеннага заканадауства Беларусі і Літвы і Утрымлівала пастановы сеймау і распараджэнні гетманау XVI-XVIII стст. Акрамя таго, некаторыя ваенныя артыкулы быги надрукаваны у храналагічным зборы нарматыуных актау ВКЛ і Польшчы, выдадзеным пад назвай «Volumina Legum» («Кніга законау») у 1732-1782 гг.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння тэрыторып ВКЛ да Расійскай імперыі у канцы XVIII ст. класічным прыкладам кадыфікацыі ваеннага заканадауства з'яуляецца Звод ваенных пастаноу 1838 г. (далей - Звод). Падрыхтоука Зводу ажыццяулялася з 1826 г. па шщыятыве генерал-маёра Д. І. Ахшарумова у II аддзяленні Уласнай Яго 1мператарскай Вялікасці канцылярыі пад непасрэдным кірауніцтвам М. М. Сперанскага. На працягу двух з паловай гадоу, з лшеня 1827 г. па люты 1830 г., была складзена першая частка Зводу; у 1830 г. - другая частка, а у 1832 г. - трэцяя і чацвёртая частш Зводу. У красавшу 1835 г. М. М. Сперансш прадставіу імператару Мікалаю I усе к н т Зводу [5, с. 496-500]. Звод быу выдадзены у 1839 г., а устуту у сшу з 1 студзеня 1840 г. У 1869 г. Звод быу перапрацаваны па новай мстэме і дзейнічау з наступнымі зменамі да апошніх дзён існавання царскай РасН.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі у гады ваеннай рэформы 1924-1926 гг. ізноУ вярнуліся да ідэі кадыфшацып ваеннага заканадауства. У загадзе РВС СССР ад 26 лютага 1926 г. № 120 адзначалась: «.назрела потребность приступить к планомерной кодификации действующих по Наркомвоенмору законоположений, дабы дать армии в стройной системе нормы, регулирующие ее устройство, службу и быт» [6, с. 22-23]. Але стварэнне «Зводу пастаноу, яшя дзейшчаюць у РККА», было ажыццёулена тольш часткова.

З пераходам да будаунщтва Узброеных Сш СССР пытанне пра распрацоуку «Зводу ваенных законапалажэнняу» было паднята зноу. Быу распрацаваны праект новай схемы Зводу. Аднак працы па падрыхтоуцы Зводу перашкодзша Вялшая Айчынная вайна. У пасляваенныя гады быги прыняты новыя агульнавайсковыя статуты, Закон аб крымшальнай адказнасщ за вайсковыя злачынствы,

Закон СССР «Аб усеагульным вайсковым абавязку», некаторыя палажэнні (аб матэрыяльнай адказнасщ ваеннаслужачых за шкоду, прычыненую дзяржаве, аб ваенных трыбуналах) і шэраг шшых нарматыуных прававых актау.

Абвяшчэнне 27 лшеня 1990 г. Дэкларацып аб дзяржауным суверэнітэце БССР, станауленне Рэспублікі Беларусь як суверэннай дзяржавы запатрабавалі стварэнне нацыянальнай прававой базы дзейнасщ Узброеных Сіл. За параунальна кароткі прамежак часу быу прыняты шэраг асноуных заканадаучых актау у вобласщ абароны, у тым лшу законы «Аб абароне», «Аб Узброеных Сшах Рэспублікі Беларусь» і інш.

Канцэпцыя удасканалення заканадауства Рэспубл^ Беларусь у якасці нашрунка прававой інфарматызацыі вызначае стварэнне і пастаяннае развіццё у Беларусі мадэлі дзяржаунай сістэмы прававой шфармацып, заснаванай на камп'ютарызацыі і аутаматызацып працэсау падрыхтоУкі, прыняцця, захоування, мстэматызацып і распаусюджвання прававой інфармацыі. Маму нарматыуных, першым чынам лакальных, прававых актау цэнтральных і шшых органау ваеннага шравання увесь час павялічваецца, і адначасова даведкавая праца па прававых актах на папяровых носьбгтах, якая праводзіцца галоуным чынам уручную, ужо састарэла.

У 2010 г. у Нацыянальным цэнтры прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (далей - НЦП1) у рамках выканання навукова-даследчых і вопытна-канструктарскіх работ распрацавана тэхналогія фарміравання і вядзення банкау дадзеных прававой шфармацып у дзяржауных органах Рэспублікі Беларусь. Гэтая тэхналогія дазваляе дзяржауным органам і іншым арганізацыям ажыццяуляць фарміраванне, вядзенне і актуалізацыю банкау дадзеных прававой шфармацыь Выкарыстанне дадзенай тэхналогп у дзейнасці Узброеных Сш, іншых войск і вайсковых фармаванняу дазволіць выйсці на якаснановы узровень забеспячэння прававой шфармацыяй адпаведных органау ваеннага шравання, вошсшх часцей і арганізацый, будзе спрыяць падвышэнню эфектыунасці сістэматызацыі прававых актау і нарматворчай дзейнасці у ваеннай сферы.

Паспяховае вырашэнне задач мстэматызацып ваеннага заканадауства, укараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій у прававую сферу будуць спрыяць павышэнню эфектыунасці прававога рэгулявання жыцця і дзейнасці Узброеных Сіл, іншых войск і вайсковых фармаванняу Рэспубл^ Беларусь, умацаванню законнасці і правапарадка, павышэнню іх боегатоУнасці і баяздольнасщ.

## Л1таратура

1. *Скарына, Ф.* Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоу., пасхалія / Ф. Скарына. - Мшск, 1990. - 207 с.

2. *Юхо, Я. А.* Исторыя дзяржавы і права Беларуси вучэб. дапам.: у 2 ч. / Я. А. Юхо. - Мшск, 2000. - Ч. 1. - 352 с.

3. Статут Вял^ага княства Лгтоускага 1588 / пер. на белар. мову А. С. Шагун. - Мшск, 2002. - 207 с.

4. Artykuly woienne: Powaga Rzeczy Pospolitey, krolow polskich, y hetmanow W. X Litt: roznymi czasy ustanawione. Teraz zas z rozkazu Jasnie Oswieconego Xiazecia Jegomosti Michala V. Kazimierza Radziwilla, woj ewody Wilenskiego hetmana Wielkiego W. X. Litt: przedruk. -Nieswiz: w druk. Xiazecej Radziwillowskiey in Coll. Soc. Jesu, 1754. - 250 s.

5. *Заусцинский, П. Ф.* История кодификации русского военного законодательства / П. Ф. Заусцинский. - СПб., 1908. - 548 с.

6. *Колибаба, Г. Н.* О кодификации военного законодательства / Г. Н. Колибаба // Военная мысль. - 1966. - № 10. - С. 20-30.

## ДАМОВА АД 23 КРАСАВ1КА 1398 г. ПАМ1Ж В1ТАУТАМ І ТЭУТОНСК1М ОРДЭНАМ ЯК КРЫНЩА ДАСЛЕДАВАННЯ АРГАН13АЦЫ1 ВАЙСКОВАЙ ЮСТЫЦЫ1 ВКЛ У XIV ст.

**В. В. Каляда**

*Акадэмія МУС Рэспублт Беларусь*

Адным з найбольш старэйшых і вядомых сучаснай псторыка-прававой навуш на гэты час актау вайсковага заканадауства Вялшага Княства Лгтоускага з'яуляецца прывілей Вялікага князя Ягайлы 1387 г. Галоунай прыкметай дадзенага прывшея з'яуляецца ягоны комплексны характар, паколькі ім былі урэгуляваны не тольш (і нават не стольш) пытанні арганізацыі войска і абароны дзяржавы, колькі пытанні дзяржаунага, шлюбнага, сямейнага і іншых галін права.

Нормы вайсковага заканадауства у дадзеным прывілеі прысутнічалі таксама. Так, прывшей узгадвау, што вайсковы паход (expeditio generalis) з'яуляецца павіннасцю, якая выконваецца за